Minsk, 29 mars 2022

**Alexandre Yarachouk : La guerre de la Russie en Ukraine n'est pas notre guerre.**
**Nous pouvons l'arrêter, nous devons l'arrêter !**

Chers compatriotes, chers travailleurs, travailleuses !

La guerre de la Russie contre l'Ukraine dure depuis plus d'un mois. Dès le début de la guerre, la Bélarus s'est rangé du côté de la Russie. Ses troupes entrent en Ukraine depuis notre territoire, des roquettes sont lancées, des avions décollent. Et plus le Bélarus s'implique dans la guerre, plus sa participation à l'agression détruit des infrastructures, des logements, tue des civils ukrainiens, des femmes, des personnes âgées et des enfants, plus les sanctions de la communauté internationale s'alourdissent à son encontre.

Nous commençons à ressentir leurs effets. Les prix augmentent, les entreprises se ferment ou recourent au temps partiel et les salaires commencent à baisser. Les turbulences ont déjà affecté des entreprises stratégiques telles que MZKT, les raffineries de pétrole et Belaruskali. Pour la première fois depuis de nombreuses années, Belaruskali a été contraint de contracter un emprunt bancaire pour payer les salaires de ses employés.

Mais ce n'est que le début. La détermination de la communauté internationale à punir les responsables de la guerre et l'ampleur des sanctions sont telles que dans quelques années il ne restera plus grand-chose de l'économie moderne du pays. Le Bélarus n'a jamais été confronté à un tel défi dans son histoire.

Le pays se dégradera progressivement jusqu'à régresser et retrouver le niveau technique et technologique de l'économie du milieu du XXème siècle. La dégradation s'accompagnera d'un chômage endémique, de salaires extrêmement bas, de la pauvreté et de l'existence misérable de la population.

De plus, le Bélarus, tout comme la Russie, en tant qu'agresseur militaire, devra payer des réparations de plusieurs milliards de dollars à l'Ukraine pour les énormes dommages causés par la guerre. Tout comme l'Allemagne nazie a payé des réparations à l'Union soviétique après la Seconde Guerre mondiale. C’est comme cela que sont apparues à Minsk les usines de MAZ, MTZ, Motovelo et d'autres.

Ainsi, le Bélarus paiera, en gageant son propre avenir, l'aventure d’avoir participé à la guerre contre l'Ukraine. Pour les années à venir, le pays a mis en jeu son existence en tant qu'État indépendant et souverain, et sa population sera au bord de la survie physique.

Ce scénario apocalyptique pour la nation ne peut être évité que dans un cas. Si le Bélarus refuse d'envoyer ses troupes en Ukraine et exige le retrait des troupes russes de son territoire. Ce n'est qu'alors que le pays pourra éviter la destruction inévitable de l'économie par des sanctions sans précédent. Chers compatriotes, travailleurs ! Le sort de notre Bélarus natal, le sort de notre peuple, le sort de nos enfants et petits-enfants dépend de nous aujourd'hui. Et ce ne sont pas que des déclarations solennelles. Ces mots n'ont jamais aussi bien reflété toute la tragédie de ce qui s'est passé pour les Bélarusses. Le Bélarus n'a jamais été aussi proche d'une catastrophe dans son histoire

et n'a jamais connu une telle honte.

Peu de pays dans le monde ont connu dans leur histoire des guerres aussi meurtrières que nous. Nous devons tout faire pour retrouver une bonne réputation, pour que le Bélarus ne soit jamais considéré comme un agresseur militaire. Et qui d'autres que nous le fera ? Le nom de notre pays, les noms de nos villages et de nos villes ne doivent pas incarner la menace et le danger pour le peuple de l'Ukraine voisine, un peuple frère. Ne doivent pas incarner la mort.

Moi, le président du Congrès bélarusse des syndicats démocratiques Alexandre Yarachouk, je m'adresse à vous. La guerre de la Russie en Ukraine n'est pas notre guerre. Nous pouvons l'arrêter, nous devons l'arrêter ! La majorité absolue des Bélarusses, 97 %, ne veulent pas que le Bélarus participe à la guerre en Ukraine ! Nos descendants ne nous pardonneront pas le silence au moment le plus critique de notre histoire ! N'ayez peur de rien ni de personne ! Il est difficile d'imaginer pire que ce qui nous arrive aujourd'hui. Jamais et nulle part au monde la demande de mettre fin à la guerre n'a été un crime ! Et jamais et nulle part au monde il n'y a eu de cause plus noble que de s'opposer à la guerre, contre le meurtre d'innocents, de femmes, de personnes âgées et d'enfants !

Exigez sur vos lieux de travail, au nom des collectifs de travail : non à la guerre, non à la participation du Bélarus à celle-ci ! Exigez l'interdiction d'envoyer des troupes bélarusses en Ukraine, exigez le retrait des troupes russes de notre pays ! Faisons-le maintenant, faisons-le aujourd'hui ! Parce que demain, il sera tard ! Parce qu'il n'y aura peut être pas de lendemain pour les Bélarusses !

***Texte original en bélarusse :***

## Аляксандр Ярашук: Вайна Расеі ва Украіне – гэта не наша вайна. Мы можам спыніць яе, мы абавязаны яе спыніць!

Дарагія суайчыннікі, паважаныя працоўныя, рабочыя!

Больш за месяц доўжыцца вайна Расеі супраць Украіны. Ад самага пачатку вайны Беларусь выступіла на баку Расеі. З нашай тэрыторыі ўваходзяць ва Украіну яе войскі, запускаюцца ракеты, узлятаюць самалёты. І чым больш Беларусь ўцягваецца ў вайну, чым больш праз яе саўдзел у агрэсіі знішчаюцца інфраструктура, жытло, забіваюцца мірныя украінцы, жанчыны, старыя і дзеці, тым больш жорскія санкцыі ўводзяцца міжнароднай супольнасцю супраць яе.

Мы пачынаем адчуваць іх наступствы. Падвышаюцца кошты, пераходзяць на скарочаны працоўны графік ці зусім спыняюцца прадпрыемствы, пачынаюцца праблемы з заробкамі. Турбулентнасць закранула ўжо такія стратэгічныя прадпрыемствы як МЗКТ, нафтаперапрацоўчыя заводы, “Беларуськалій”. На “Беларуськаліі” упершыню за многія гады вымушаны былі браць крэдыт у банку для выплаты заробкаў работнікам.

Але гэта толькі пачатак. Рашучасць міжнароднай супольнасці пакараць вінаватых у вайне і маштаб санкцый такі, што праз некалькі год ад сучаснай эканомікі краіны мала што застанецца. Ніколі ў сваёй гісторыі Беларусь не

сутыкалася з падобным выклікам.

Краіна будзе няўхільна дэградаваць да тэхнічнага і тэхналагічнага ўзроўню эканомікі сярэдзіны мінулага стагоддзя. Дэградацыя будзе суправаджацца павальным беспрацоўем, крытычна нізкімі заробкамі, галечай і жабрацкім існаваннем насельніцтва.

Больш за тое, Беларусі разам з Расеяй як ваенным агрэсарам прыдзецца выплочваць Украіне шматмільярдныя рэпарацыі за нанесеную вайной велізарную шкоду. Так, як выплочвала рэпарацыі па выніках 2-й Сусветнай вайны Савецкаму Саюзу фашыстоўская Германія. Менавіта адтуль з’явіліся ў Мінску МАЗ, МТЗ, мотавела і іншыя заводы.

Такім чынам, за авантуру ўдзелу ў вайне супраць Украіны Беларусь будзе расплочвацца літаральна сваёй будучыняй. У бліжэйшыя гады краіна будзе пастаўлена на мяжу існавання як незалежная і суверэнная дзяржава, а яе насельніцтва – на мяжу фізічнага выжывання.

Гэтага апакаліптычнага для нацыі сцэнара можна пазбегуць толькі ў адным выпадку. Калі Беларусь адмовіцца ад увода сваіх войскаў ва Украіну і запатрабуе вываду з яе тэрыторыі расейскіх войскаў. Толькі тады краіна можа пазбегнуць немінучага руйнавання эканомікі праз беспрэцэдэнтныя па сваім наступствам санкцыі.

Паважаныя суайчыннікі, рабочыя! Менавіта ад нас сёння залежыць лёс нашай роднай Беларусі, лёс нашага народа, лёс нашых дзяцей і ўнукаў. І гэта не проста высокія словы. Яшчэ ніколі яны не ўвабіралі ў сябе для беларусаў ўвесь трагізм таго, што адбылося. Яшчэ ніколі ў сваёй гісторыі Беларусь не была так блізка да катастрофы, і ніколі яшчэ не прымала на сябе такую ганьбу.

Мала хто ў свеце перанёс ад войнаў такія пакуты і такія страты як мы. І каму, як не нам, выпадае зрабіць усё для таго, каб вярнуць сабе добрае імя, каб ніколі Беларусь не лічылася ваенным агрэсарам. Каб нашыя родныя мясціны, каб назва нашай краіны, назвы нашых сёл і гарадоў не ўвасаблялі ў сабе пагрозу і небяспеку для жыхароў суседняй, братэрскай для нас Украіны. Адкуль для іх прыходзіць смерць.

Я, старшыня Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук заклікаю вас. Вайна Расеі ва Украіне – гэта не наша вайна. Мы можам спыніць яе, мы абавязаны яе спыніць! Абсалютная большасць беларусаў, 97 адсоткаў, не жадаюць ўдзелу Беларусі ў вайне ва Украіне! Нашыя нашчадкі не даруюць нам маўчання ў самы крытычны час нашай гісторыі! Не бойцеся нікога і нічога! Больш страшнага, чым адбываецца з намі сёння, цяжка сабе ўявіць. Яшчэ ніколі і нідзе патрабаванне спыніць вайну не было крыміналам! І яшчэ ніколі і нідзе не было больш высакароднай справы, чым выступаць супраць вайны, супраць забіцця ні ў чым не павінных людзей, жанчын, старых і дзяцей!

Патрабуйце на сваіх рабочых месцах, ад імя працоўных калектываў: не – вайне, не – удзелу ў ёй Беларусі! Патрабуйце забароны адпраўкі беларускага войска ва Украіну, патрабуйце вываду расейскіх войскаў з нашай краіны! Давайце зробім гэта неадкладна, зробім сёння! Таму што заўтра будзе позна! Таму што заўтра для беларусаў можа не наступіць ніколі!